Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспадэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і вуторам назад іх не звертае.

Год IX. 16 Мая 1914 г. № 19

**1-ая Акалічная выстаука Культуры торфянікоу, лугаводзтва і торфаваданьня у ВІЛЬНІ**

устраіваецца Віленскім і Ковенскім Таварыствамі Сельскай Гаспадаркі 15—23 жніўня 1914 г.

Адрэс Камітэта выстаукі:

*Вільня, Віл. Т-во Сельскай-Гаспадаркі Завальная 9.*

†

# ВЛАДЫСЛАУ СЫН ІГНАТА ЭПІМАХ-ШЫПІЛЛО.

(ПАСЬМЕРТНЫ ЎСПАМІН).



Ешчэ адну ахвяру вырвала безжаласная сьмерць з невялічкай сямьі сьвядомых беларусоў, закінутых нядоляй у далёкую чужыну. У пецярбурзе 6 мая гэтаго году посьле доўгіх і цяжкіх мук памёр (ад рака) Владыслаў Эпімах-Шыпілло. Радзіўся Владыслаў у 1864 г. у фол. Залесьсе, Лепэльскаго павету, Вітэбскай губ., не падалёк ад Полацка Бацька яго і матка — Анна Олецкая—паходзілі з дробнай беларускай шляхты. Навукі праходзіў Владыслаў спачатку у Рызе, дзе кончыў гімназію, а потым слухаў лекцый у Пецярбурскім унівэрсытэці на фізыко-матэматычным факультэці. Посьле навук пaступіў на службу у Міністэрства Фінансоў, у Дэпартамэнт Гасударств. Казначэйства у каторым і закончыў сваё жыцьцё. Асіраціў нябошчык жонку, тры дачушкі і сына, каторы вучыцца у гімназіі.

Адарваны змалку дзён ад роднай старонкі, шукаючы навукі і хлеба паза межамі яе, светлай памяці Владыслаў да самай сьмерці не прэрываў духоўнаго звязку са сваей бацькаўшчынай-маткай. Калі у 1905 гаду пачало усё жывое, але спячае, у Расеі будзіцца і між іншым, калі сталі арганізавацца у Пецярбурзе беларускіе студэнцкіе гурткі дзеля культурнай рабсты на карысць свайго краю, то ў гэтых гуртках прыймае шчырае учасце і нябошчык Владыслаў. У ніякую палітыку ён не мешаўся ды і не знаўся на ёй, ён быў толькі з Божай ласкі артыста-мастак. І вось, як толькі задумалі беларусы устраіваць у Пецярбурзе беларускіе прэдстаўленьня, то Владыслаў насамперш і найшчырэй бярэцца за гэту святую справу. Роднае беларускае слова было для яго на чужыне ядынай асалодай у жальбе па роднай старонцы. Пад яго загадам і ў многім, дзякуючы толькі яму і яго вытрываласьці, ставюць на Пецярбурскіх сцэнах у працягу колькі апошніх гадоў беларускіе прэдстаўленьня: „У зімовы вечэр“, „Па рэвізіі“, „Пашыліся у дурні“, „Міхалка“, „Паўлінка“, „Хам“ і інш.

Владыслаў бярэ на сябе найтруднейшые і найдаўжэйшые ролі, бярэ іх ён, а ня хто другі, бо тым німа часу, а тые ня могуць гэткую ролю сходаць. І, дзякуючы гэтаму чэлавеку, на далёкай чужыне, паміж фінскіх балот, у халоднай і не прыветнай сталіцы, зычыць са сцэны беларускае жывое слова; тысячы беларусоў, адарваных ад роднай зямелькі і другіе тысячы чужынцаў слухалі і дзіву даваліся тэй неапісанай красе—музыцы, зачараванай у зычнай мове нашых прадзедоў.

Пішучый гэтые словы сам быў сьведкам якое ўражэньне рабілі н слухачоў гэтые прэдстаўленьня і як для гэтаго ўсяго працаваў Владыслаў не апускаючы рук да самай сваей сьмерці. Тыпы створэные ім у беларускіх сцэнах застануцца на заўсёды ў памяці жывых. Пецярбурскіе беларусы папраўдзе асіроцелі: сьмерць адабрала ім ня толькі добраго чэлавека і шчыраго грамадзяна, адданаго беларускай справе, але страцілі з ім праўдзіва ідэёваго артысту-мастака, адданаго усей душой і ўсім сэрцам беларускаму вечна-жывому слову.

Гэты шчыры жаль усіх знаючых нябошчыка беларусоў выліваўся і на сумнай апошняй паслузе для яго, на хаўтурах. На хаўтуры сабралася чуць не ўся беларуская калёнія, а найболей студэнтоў. На магілку узлажылі вянкі між іншымі с такімі надпісямі: «Дарагому таварышу і правадыру Пецярбурскіе беларусы», «Міламу бацьку студэнты-беларусы» і шмат др. Ад студэнтоў вянок быў з жывых кветак. Над магілай гаварылі прамовы толькі па беларуску. Між іншымі ад студэнтоў-беларусоў сказаў пекную прамову студэнт Тарашкевіч, у каторай зазначыў той глыбокі жаль па нябошчыку і тую вялікую ідэёвую працу, якую Владыслаў нёс на сваіх плечах. Дэлегатам ад Віленскіх беларусоў: ад рэд. «Наша Ніва», ад «Беларускаго Музыкально Драматычн. Кружка і ад «Беларускаго Выдавецкаго Таварыства» быў на хаўтурах Янка Купала, каторы прачытаў заместа прамовы вершы, пасьвячэные памяці нябошчыка. Вершы зрабілі сільнае ўражэньне на сабраўшыхся. Калі скончыўся сумны абрадак пахаваньня, народ ешчэ доўга не расходзіўся, якбы думаў, што гэта усё сон, што нябошчык устане з магілкі і пойдзе з жывымі да вялікай працы над Бацькаўшчынай Маткай.

Я стаяў ў старане і сьлёзы нестрыманаго жалю душылі мне горла. Ня ведаю чаму, успомніўся мне сумны верш Коласа: «Пахаваньне»:

...Чую прычытаньня,  
Чую плач я нейчы.  
Скончыўся зараньня  
Век твой, чэлавечэ!

Хай-жэ будзе лёгкай зямелька для цябе, шчыры наш беларусе. Памяць аб табе ніколі не загіне ў сэрцах беларускіх, як ня гіне усё добрае, сьветлае, вечнае.

**К—а.**

---

### Сьветлай памяці
## Владыслава Эпімах-Шышілло.

Здалёк ад роднай стараны,  
Ад беларускіх ніў і хат.  
Ён жыў, як кветка на мяжы,  
Якую хвошчэ дождж і град.

Ён жыў і бацькоўшчыне ўсьцяж  
Не пакідаў—як мог—служыць,  
Душу і сэрцэ аддаваў,  
Пакуль ня стлела жыцьця ніць.

Да самай страшнае пары,  
Што нам яго ўзяла на век,  
Ён быў заўсёды і для ўсіх  
Грамадзянін і чэлавек.

Для Беларусі, як умеў,  
І сколькі сілы меў служыў,  
І не чэкаў сабе наград,  
Адно радзімым словам жыў.

Любіў яго, пацеху ў ім  
І веру крэпкую ў ім меў,  
На службу верную яму  
Астатак сілаў не жалеў.

Артыстам будучы душой  
Красу ён родну праслаўляў:  
Са сцэны родную зямлю  
І слова роднае усхваляў.

А сам... Не рваўся к славе ён,  
Пахвальных гымноў не жадаў,  
Паціху між братоў ішоў,  
Аб долю лепшую іх дбаў.

Не зачыняў сваіх дзьвярэй  
Для сваяка і чужака.  
Пацеху сумнаму ўмеў даць  
І надарыці бедака.

Сягоння тут, у чужыне,  
Яго анельская душа,  
У жальбе кідаючы ўсіх,  
У край незнаны адышла.

Сьпі, грамадзянін добры наш,  
Хай будзе кветкамі зямля,  
Як кветкай мілаю для нас  
Ты быў, гаротнік за жыцьця.

Хай над магілкаю тваей  
Вандроўна птушка запяе,  
А сонцэ яснае з нябёс  
Сваё праменьне вечна лье.

Хай вольны вецер данясе  
Сумную вестку ў родны край,  
Што сын яго адзін ешчэ  
ў чужыне выбыў ў лепшы рай.

Сьпі, грамадзянін добры наш,  
І сны шчасьлівейшые сьні,  
Чым тые, што меў у жыцьці,  
Ад роднай вырваны зямлі.

**Янка Купала.**

Пецярбург 10/V—14 г.

---

# З народам і для народа.

Будучына нашаго народу не ў панох — бо яны адступіліся і зракліся сваей маці Беларусі, не ў мешчанстве — бо яго малая горстачка і яно перапоена тандэтнай карчомна-гарадзкой «культурай», не ў чыновенстве — бо яно, прадаючы сваю працу, прадае найчасьцей і душу сваю, — і не работніцкіе массы, бо іх лішне мала наагул, а ешчэ менш сьвядомых. Дзеля гэтаго нашэ адраджэньне павінно апірацца на шырокіх народных—селянскіх массах. І тады толькі Беларусь адродзіцца, калі у найдалейшые закуткі краю дойдзе беларуская нацыональная сьвядомасць.

«Толькі тое жыве, трывае і разрастаецца, што праз просты народ аджывае у выдатных людзях, і праз гэтых выдатных людзей вядзе народ да само сьвядомасці» — сказаў адзін пісьменнік. Гэтые словы мы павінны паўтараць сабе заўсёды, калі мы у нашай працы над народам і для народу пачынаем прыставаць, расчаровывацца і астыгаць. Наша валікая памылка, а нават правіна, гэта думка, што мы працу над народам і з народам лічым за рэч меней-болей улюбленую, а не за павіннасць. Многа хто з нас ня хочэ зразумець, што праца над народам і для народу—гэта наша нацыональная павіннасць і ад гэтай вялікай павіннасці ніхто нас ня можэ звольніць.

Жыхары сёл—селяне—гэта наша сіла, моц, надзея і будучына. Бо нашы селяне, гэта мільёны сэрц і душ. Гэта мільёны сільных рук да працы. Гэта скарбніцы, каторые перэховываюць народные звычаі-абычаі, трацыції, мову і нашы нацыональные прыметы. Наш народ—гэта мільёны талентоў, вялікіх здольнасцей, а нават геніёў. Народ — гэта і ёсць наша вялікая бацькоўшчына «Ад Дзьвіны і да Прыпеці; ад Днепра і да Бугу вод...» Наш народ гэта той магутны волот, каторы дрэмле, абапершыся локцям аб муры Смаленска, а нагамі упершыся ў Прыпяць. Праз доўгіе векі наш народ быў сам сабе пакінут, без апекі, без прасьветы. Ды ешчэ горш праз доўгіе векі наш народ быў прыгнечэн, аддадзен на ганьбу і здзекі, несправедлівым ладам. І ці можна дзівіцца, што ён стаўся такім, якім ёсць? Трэба дзівіц-

ца, што не глядзя на рабства у якое быў ён запражэн і дэмаралізацію, якую у ім шырылі верхаводы, ён патрапіў захаваць у сваей душы многа вялічы, красы і добра, ды астаўся Беларускім народам і ёсць ім запраўды.

Гэтые мільёны чорных рук, гэтые мільёны пахіленых плеч, гэтые глыбокіе барозны на абліччах, вырытые клопатамі ды недахватам хлеба і солі;—недастаткам дастаткоў, а нават надзеі — усё гэта сумны, але праўдзівы абраз нашаго народнаго беларускаго жыцьця. Гэтая жальба, што плыве с сёл песьняй у нашы сэрцы і прамаўляе да нас магутным заклікам памагчы прымушае нас скіраваць усю сілу і накланіць жалезную волю, каб нашу народную павіннасць мы маглі спаўняць належна і правільна. А праца чэкае нас вялікая! Мінуўшые часы нанясьлі багата багна ды гразі у найлепшые нават душы. Ужо яны палошчуцца і вымываюцца народнай работай, але ешчэ саўсім абмыцца ня могуць. Дзеля гэтаго не дзівуйця, што ешчэ душа народу саўсім абмыцца ня можэ. Не дзівуйця, што ў душы народнай ёсць ешчэ многа багнабалота, якое наняслі у яе доўгіе векі падданства і цемнаты, а пасьля цяжкіе гады раскраданьня беларускай народнай душы з расейскаго і польскаго боку. Не дзівуйцеся, што нашэ селянство ешчэ не такое сьвядомае, якім бы яго хацелі бачыць, што у ім німа таго гарачаго беларускаго патрыотызму, любові да свайго, якое павінно быць у кожным сарганізаваным і шануючым сябе грамадзянстве. Падумаймо аб тым, што дагэтуль над нашым народам ешчэ ніхто не працаваў, а толькі усе стараліся рваць яго душу і забіваць у ім пашану да самога сябе. І не дзівуйцеся, што народ сам, мае правіны, што часам зблудзіць с простай дарогі, але пасьпешайця яму на помач з гарачым сэрцам і шчырым словам, каб працаваць над ім і разам з ім, бо ў ім дрэмле вялікая сіла і моц, бо у ім наша вялікая і сьветлая будучына.

Браты, ідзіця у народ, зблізжайцеся з ім, працуйця з ім для яго!..

**Народны вучыцель.**

---

## Камэдыя ці трагедыя?

У Думі пачаліся прамовы с прычыны вядомаго цыркуляра рыжскаго папечыцеля я—сця Шчэрбакова, каторы забараніў вучыць у народных школах мейсцовымі мовамі. Між іншым я—сць Мэйендорф паясьніў, што школы у латышчыне апынуліся у дзіўным палажэньні. Учыцелі маюць тайны наказ не звертаць увагі на цыркуляр я—сця Шчэрбакова і вучыць мейсцовымі мовамі, толькі аб гэтым не гаварыць голасна. Нашто-ж гэта камэдыя, ня годная вялікаго гасударства? - пытае абурэный дэпутат.

Дзіўнае палажэньне запанавало у латышскіх правінціях і адмечэная «камэдыя» выяўляецца поўнасьцю па ўсім прасторы гасударства, дзе жыхары не належаць да вялікарускаго народу. Мы ведаем, што скрозь цыркуляр за цыркулярам выходзіць аб тым, каб вучыцялі ня сьмелі звертацца да вучнёў у роднай мове. Але так сама мы ведаем, што і без ніякіх тайных наказоў вучыцелі не маюць змогі выпаўняць тые цыркуляры і павінны не звертаць увагі на іх, калі хочуць каб з навукі іхняй была хоць якая небудзь, хоць малая карысць. Вучыцель, пакуль ён запраўды хочэ чаго небудзь навучыць сваіх вучнёў, а ня толькі формальна «назубрыць» колькі кепска вагаварываных фраз, павінен аткінуць усе цыркуляры і слухацца голасу самога жыцьця. А яно цьвярдзіць, што толькі роднай мовай і можна чагось навучыць, толькі разумеючы вучыцеля, могуць навучацца вучні. Тым болей, што у тых самых цыркулярах знаходзім і вымаганьня, каб вучні ўзапраўды нешта ведалі, а не па сарочаму баўбаталі незразумелые словы. Вось, ужо адно гэта спыняе усе забароны што сыцлюцца на родную мову, і без усякіх тайных наказаў, паняволівае ня слухаць яўных цыркуляроў. Праўда, учыцелём, каторые ня ўмеюць зручна кіравацца паміж сетак цыркуляроў, грaзіць небаспека выляцець за парог школы; праўда, гаварыць голасна ім пра вымогі жыцьця ім «не полагается». і ось гэта — тую камэдыю, аб каторай гаварылася у Думе — зменяе у трагедыю.

Ніякімі спосабамі, ніякімі цыркулярамі ня можна знішчыць патрэбы у школе роднай мовы, і змаганьне проці роднаго слова зменяецца у змаганьне проці культуры. Ведама, правые крычаць будуць—што навучаньне роднай мовай паніжае значэньне школы, бо дзеці, бытцым не навучацца расейскай мовы. Але гэта толькі пароžніе словы, бо ужо фактамі даведзена, што абрусіцельная школа якраз і немае змогі выпоўніць нават сваей найпершай мэты,—навучыць расейскай мовы. Аб культуры ўжо лепей не гаварыць, што калі ня глум над усякай культурай, тые абрыўкі веды і той гідкі жаргон, якій толькі і можэ даць сучасная школа усім невялікарусам? Памімавольна спамінаецца тая прыкрая характэрыстыка школьнаго абрусеньня, што вырвалася з уст найбольшаго расейскаго пэдагога, аб калечэньні душы дзіцячай, аб дэморалізації і распусце, што з усіх старон сее школа — ніжэйшая, а не вышэйшая ад таго народу які яна павінна асьвечаць. І гэта культура?

Не культура гэта, глумленьне культуры. І парадкі, што фактычна пануюць на усім абшары гасударства, апрача вялікарасейскай тэрыторыі, саўсім не камэдыя, а трагедыя. Трагедыя перш наперш народу, каторы за свае грошы, за свае ахфяры, за сваю ахвоту вучыцца, мае ня хлеб, а камень, мае не культуру і веду, а здзек с сябе ды огнішчы дэмаралізації. Трагедія вучнёў, каторые пакутуюць ад гэтай сыстэмы, каторая у дзіцяці бачыць не асобу, катарая хочэ вучыцца і толькі вучыцца, а бачыць рэч да сваіх дэнаціоналізатарскіх спроб.

Трагедыя ў рэшці і для вучыцеля, каторы павінен зрабіцца машынай нічога супольнаго не маючай с праўдзівай навукай і яе мэтамі. І можэ нават для самога гасударства трагедыя, бо замест сьвядомых грамадзян, дастае с сучасных школ задурэных і затуманеных, несьвядомых і цёмных людзей, каторые правай ад левай рукі не навучаюцца адрожніваць. Да таго-ж выдаючы адной рукой забароны і цыркуляры, другой рукой гасударство павінно касаваць іх пакрыёму, прызнаючыся, што німа способу дасягнуць тэй мэты, якую сабе ставіць, і выказываючы гэтым сваё бязсільле у вайне з жыцьцём.

Не камэдыя гэта, а, зноў кажэм, трагедія. Трагедыя з усіх старон. Трагедыя нікому нават непатрэбная, апрача кучкі абрусіцелёў, каторые з абрусеньня зрабілі сабе крыніцу даходаў. Трагедыя, каторай апошняго акту не маем ешчэ, але каторы прыйдзе калісь, калі не ачуняе гасударства с таго пьянаго гаду, што напусціў цэнтралізм ды абрусіцельная сыстэма.

**С. Е.**

---

# ЛЮБОЎ АГАТКІ.

*Пасьвячаю П. Л. П—ову.*

Слаўная дзяўчынка была Агатка.

Заўсёды вясёлая, заўсёды чырвоная, з вялікімі і пекнымі шэрымі вачамі, яна не аднаму дзяцюку у сяле закруціла галаву. Добра ей жылося у сваіх бацькоў. Хаця яны і не былі багатые, але гаспадарка ішла ніштo сабе. Агатка была аднэй дачкой у бацькі, ведама, надта любілі яе і патуралі ей нават тады, калі да яе пачалі ужо ездзіць сваты. Але замуж яна не сьпешалася, бацькі зноў яе не прымушалі.

Прышла семнадцатая весна. У сваім маладым сэрдцы Агатка пачула нешта новае, незнаёмае: сэрцэ было поўна неясных жаданьнёў і салодкіх трывог.

У тым сяле, дзе жыла Агатка, быў хлопец Лукаш. З ім ей, ведама, прыходзілося часта сустрэчацца і яна моцна, усімі чарамі першай дзявоцкай любві, палюбіла яго. І як было ей не любіць яго: ён такі статны, харошы, такі добры, не падобны да другіх, такі разумны. У яго душы было нешта асобнае, чаго у другіх дзяцюках яна не знаходзіла.

Мастацкую, глыбокую душу меў Лукаш.

Здатней яго ніхто не танцаваў у сяле, лепей яго ніхто ня умеў іграць на скрыпцы. Пекны і мяккі голас даў яму Бог. Часам пад вечар, пасля дзеннай працы, любіў ён, ўзяўшы скрыпку, іграць на ей і сьпеваць жалосные песьні. Скрыпка, як жывая, плакала і стагнала у яго руках, а Лукаш падпеваў ей. І відаць было, і чутно было, што яны здружыліся, што яны адзін другога зразумелі...

І здавалася, што перад вамі у простых будзенных апратках сядзіць не селянін, а інтэлігент-артыста, з мастацкай чулай душой, з душой, сатканай с тонкіх, галосных і чуткіх струн...

— Любіла Агатка слухаць яго сьпевы і музыку, як і любіла яго. Кажды раз, як яна слухала яго, на яе пекные вочы находзілі сьлёзы, сьлёзы салодкіе, галодные, як голас і погляд Лукаша. А ён сам так любіў іграць пры ей. Ён і не прымечаў таго, што пры ей заўсягды з большым пачуцьцем і ахвотай ён іграў...

Моцна, паэтычна любіў Лукаш Агатку. Любіў так, як толькі пазваляла яго мяккая, глыбокая душа. Апошніе дні ён стаў прымечаць, што, што-б ён ні рабіў, на вум прыходзіць яго мілая Агатка, што работа не так клеіцца і яму хочэцца скарэй вечара, калі ён, вярнуўшыся с поля, можэ увідзіць яе.

Шчаслівая, таёмная, залатая пара любові прышла для Лукаша. Часьцей ён стаў цяпер гаварыць са сваей скрыпкай, часьцей стаў паведаць ей боль і радасьць свайго сэрца. У канцы села, у садочку Тамаша Мікіценкі, Агаткінаго бацькі, стаяла раскідзістая старая ліпа. Гэта ліпа, мусі, на сваём вяку не бачыла пад сабой другой такой шчасьлівай парачкі.

Лукашу здавалася, што ўвакруг яго усё радуецца, сьмяецца. Са ўсімі яму хацелася быць ласкавым, і шчасьце, здавалася, агарнуло яго са ўсіх бакоў. Ён задумаў жаніцца. Пасватаўся да Агаткі. Бацькі, ведаючы Лукаша як добраго і багатаго чэлавека, са шчырым сэрцэм, аддавалі за яго сваю дачушку: яны ведалі, што за ім яна ня будзе пакрыўджэна.

Пачуўшы, што скора будзе вясельле Лукаша і Агаткі, дзеўчаты і хлопцы с зайдрасьцю сталі паглядаць на гэту шчасьлівую парачку, як яна праходзіла праз сяло.

Ужо прачыталі першае аглашэньне. Назначылі дзень шлюбу. Лукаш, сабраўшы троху грошэй, рашыў паехаць у горад N, каб там сшыць сабе гарнітур, купіць што-колек і, што важней за ўсё, узяць грошы ад аднаго чэлавека, каторы быў вінен яму.

Да гораду была усяго адна станцыя. Да вагзалу ад роднай вёскі трэ' было ехаць канём 9 вер.

Канчаецца дзень. Вецер сціх. Змоўклі птушкі. Сонейко ужо схавалося за гару. Чырвона-жоўтае полымя праважае яго. На дарозе падняўся пыл: пастухі гоняць да хаты скацінку, стараючыся не папасьці у пыл і загадзя павярнуць у бок. На сустрэч ляціць хурманка. Гэта Агатка. дзевяцілетні хлопчык-хурман, брат Агаткі, і Лукаш едуць да вагзалу. Агатка праважае яго.

Дзінь дзінь,—данясьліся два доўгіх, а за імі некалькі кароткіх удароў званка: с суседняй станціі вышла машына. Прайшло крыху часу, аткрылі кассу. Узяўшы білет і сказаўшы хлопчыку, каб пільнаваў кабылку, Лукаш з Агаткай адышліся і прыселі на лаўцы пад бярозкамі, што раслі пры вагзалі.

Неба пачало цямнець. Стала крыху сцюдзёна. Прытуліўшыся адзін да другога, ціха гаварылі паміж сабой Лукаш і Агатка. Два дні прабудзе у горадзі Лукаш, ня доўга Але і таму і другому не хацелося разставацца нават на такі кароткі час. Усяк бывае, усё можэ здарыцца.

Прытка ляцеў час. Здалёк нешта загрымело і ўскорасьці паказалася чорная галава машыны. «Так скора!» ў адзін голас сказалі абое, неласкава глянуўшы на машыну, што хутка павінна іх разлучыць і пашлі на пляцформу Далі другі званок. «Ідзі садзіся», сказала яна. «Пасьпею ешчэ», адказаў ён, сквапна пацалаваў і з нейкім жалям і трывогай стаў глядзець у яе вочы. Хвілі бягуць і бягуць. Трэцці званок, сьвісткі, кранулась машына... Доўгі, доўгі пацалунак.. Цяжка было Лукашу адарвацца ад мілаго твару. Агатка адпіхнула ад сябе Лукаша, той апомніўся... «Прашчай. то ў чэцьвер назад», крыкнуў ён і пабег разам з машынай, каб на хаду ускочыць. Агатка стаіць адна і глядзіць с трывогай яму у след. «Дай, Божачка, яму ўсё добрае», маліцца яна.

Машына йдзець усе скарэй і скарэй; вось ужо предапошні вагон, куды Лукаш думае ускочыць... «Каб хоць не астацца», думае ён і хватаецца за ручкі.

«Асьцярожна!» Крычыць нехта зьверху... Позна!..

Лукаш абарваўся, ногі неяк пасьлізнуліся і ён пакаціўся ўніз ... Сходцамі яго ударыло і палажыло ўдоўж рэльсоў... Пранёсся поезд... Жандар, начальнік станціі і другіе кінуліся да Лукаша... А ён лежаў удоўж рэль-

# Земства і воласць.

## I

### Што такое земства.

„Ой многа, многа для вёскі убогай трэба зрабіць каб добра жыла“. З якога боку на нашэ жыцьцё не глянуць, якую старану яго ні пачаць разгледаць, усюды мы убачым адно і тое ж самае, што каб ткі лепей зажыла убогая вёска—шмат у чым патрэбны перамены. Шмат бядней і пушчэй жыве у нас народ як па другіх краёх. Багата чаго што тамака даўно ужо зроблена ды добра нарыхтавана у нас німа.

Праміж іншым (кажу праміж іншым, бо аб другіх ня меней важных патрэбах селянскаго жыцьця я, трымаючыся рамак пастаўленых загалоўкам стацьці, тутака гаварыць ня буду) — звертае на сябе пільную увагу вось што.

Дужа цёмны цяпер наш народ, гэта праўда. Шмат уселякіх забабонаў і страхаў яго трымаецца. Часта кідаюцца у вочы патрасаючые абразкі «жніва цемры» — казаў той «у балоці народ жывець, ліповаму пню моліцца». Ня лёгка перамагчы народную цемнату. Векамі збіралося і расло усё гэта, векамі калечылася народная душа ды пакрывалася уселякім брудам, глыбокіе карэньні панаваньня цемры пусьціло. Глыбокіе ды усестаронные перамены патрэбны для таго, каб змаганьнё з імі дало добрые рэзультаты. Агромнае значэньне мае тут асьвета. Трэба каб усе былі грамтны, каб школ было гэтулькі, што б усе маглі у іх стоўпіцца. У школах павінны у роднай зразумелай мові вучыць таго, што у нашым жыцьці найболей карысна і патрэбна. Школа павінна працаваць над пашырэньнем кругазору народу — павінна рупіцца каб яе гадунцы былі знаёмы з глаўнымі законамі прыроды і грамадзкаго ладу—каб яны прывучаліся незалежна і крытычна думаць. Для падняцьця культурнай вышыні народу аднэй школы мала. Трэба завясьці усюды па мястэчках і вёсках добрые бібліотэкі і чытальні каб кожны, хто хочэ што прачытаць—бяз вялікага клопату мог здаволіць гэту патрэбу; трэба арганізаваць народные хоры і тэатр, каб і пагулядзець было на што свабоднай часінкай, трэба... ешчэ шмат чаго зрабіць у гэтым кірунку усяго і не пералічыш. Паменшало бы тады, а с часам і саўсім счэзло—пьянство і буянство — пачалібы вяскоўцы жыць не па звярынаму, а па людзку у поўным значэньні гэтаго слова.

Усё гэта пачынае цяпер што раз то болей і лепей разумець і сам народ. Усё прыбывае ды прыбывае селян, каторые горнуцца да дабра, праўды і сьвету—каторые хочуць болей даведацца, пачаць жыць культурна. Што ж калі німа як. Школ мала, далёка ня ўсе дзеткі могуць там стоўпіцца; бібліотэк, чытальняў ды іншых культурных устаноў даступных селяніну, так як бы і німа; вучуць па школах у чужой мала зразумелай мові ды далёка не таго, што трэба і гэтак далей. Пры такіх варунках нават тым селянам, што цяпер маюць культурные патрэбы ня лёгка іх здаволіць дзеля чаго парываньня к святлейшаму жыцьцю шмат у каго слабеюць. Самі яны дзічэюць, апускаюцца ажно пакуль ня зробюцца гэткімі, як і ўся народная масса. Тымчасам трэба каб было іначэй, каб ня толькі не дзічэлі болей культурные селяне, але лік культурных селян трэба каб усё большаў бы ды большаў. Каб другіе, прыглядаючыся да іх жыцьця, самі захацелі бы гэдак сама жыць.

Далей канешне патрэбны: бальніцы дзе дарма лячылі бы хворых, дактары, вэтэрынары (скацінные дактары), адвакаты — каторые-бы дарма давалі уселякіе рады. Цяпер гэткай помачы народу у нас дужа мала. Вось лечыцца народ у шэптуноў, скацінку водзіць да канавалоў, судзіцца, слухаючы вясковых «адвакатоў» уселякіх лайдакоў, каторые цкуюць людзей адных на другіх каб болей было судоў і звадак, а «адвакатам»—заработкоў. Праўда каб і былі безплатные доктарскіе ды адвакацкіе рады — можэ і тады нашліся бы (асабліва с пачатку) людзі думаючые што с шэптуна болей карысьці як з доктара—але пабачыўшы на свае вочы чыя рада болей карысна с часам усе пакінулі бы гэтых ашуканцоў. Цяпер іншы селянін разумее усё гэта, рад бы звярнуцца па разумную раду—але то некалі, або німа у каго бліз ка парадзіцца, або за раду вялікіе грошы бяруць. Дзеля чаго, хочучы ня хочучы, звертаецца іншы да шэптуна бо гэта і бліжэй і таней.

Патрэбны нам гэткіе дарогі каб у усякае надворье можна было праехаць не паламаўшы снасьці ды ня здушыўшы каня. Якіе дарогі цяпер, кожны ведае ня ўсе селяне і цяпер кажуць: «пры дзядох і бацькох не было, то — ня трэба і нам». Шмат хто рад быў бы сёе-тое завясьці у гаспадарцы новае, каб большы мець даход, але не вядома як за гэта узяцца ды і грошы німа каб нарыхтаваць гаспадарку па інакшаму—лепей.

Вось канешне патрэбны і тут вучоные людзі каторые с толкам маглі бы параіць што рабіць. Гэткіе людзі (аграномы ды усякіе інструктары) павінны даваць безплатные рады, мала таго, павінны ездзіць па вёсках—чытаць лекціі, тлумачыць што «во, людзям трэба зрабіць тое ды сёе». У аднэй вёсцы напрыклад варункі такіе што карысна гадаваць гусей, во трэба параіць як нарыхтаваць гэта;— у другой што іншае добра было бы наладзіць. Гэтые людзі каб прынясьці праўдзівую карысць народу—павінны любіць гэты народ, шчыра спагадаць яму, сумленна працаваць для дзела — а ня тое абы толькі збыць; павінны добра знаць мейсцовые варункі ды рады даваць с толкам. Калі (як гэта часта бывае цяпер) аграномамі будуць людзі не знаючые, як трэба, ні свайго дзела, ні варункаў—думаюшчых болей аб тым як бы большае жалаваньне браць, чым аб народнай карысьці, тады яны зробюць адну толькі шкоду. Народ, чуючы безталковые рады ад адных, ня будзе верыць і другім ды звыкнецца з думкай, што ніякага толку ад перамен у гаспадарцы німа. Тымчасам, чуючы разумнае слова—адны паслухаюць адразу, другіе, прыгледзіўшыся на першых, значэ крыху пасьля. Карысць з гэтаго выйдзе выразная і відавочная. Бачучы гэта памаленьку завядуць тое і усе.

Для перамен у гаспадарцы ды лепшаго нарыхтаваньня яе часта патрэбны гэткіе грошы, якіх гаспадар не мае. Трэба наладзіць танны павер (крэдыт) каб без вялікаго клопату можна было б на выгодных варунках дастаць аттуль грошы.

Усе гэтые і таму падобные чправы дужа вялікае маюць значэньне. Але добра нарыхтаваць іх могуць толькі людзі сумленные, шчыра прыхільные народу і знаючые мейсцовые варункі. Хто ж лепей ад самых тутэйшых жыхароў можэ ведаць што для іх старонкі трэба і хто апрача мейсцовых людзей патрапіць найталкаўнейшы загад даць гэтым справам?—Пэўне што ніхто. Вось найлепей будзе калі установы парадкуючые вышэй абгаворэнные справы будуць складацца з людзей выбранных самімі жыхарамі гэтай старонкі. Гэтые выбраные людзі з'едуцца ды абгаварыўшы пастановюць, што трэба рабіць, як наладзіць тую ці іншую справу, якіх вучоных людзей, даючых рады народу наняць на службу, якое плаціць ім жалаваньне (усе рады вучоные павінны даваць

---

соў акрываўленым і абадраным тварам уверх, стагнаў і корчыўся. Паднялі яго, каб палажыць на плятформу. Людзі разступіліся і Агатка увідзела нешта страшнае, ад чаго яна дзіка, непрытомна закрычала і абамлеўшы, павалілася на зямлю... Левая нага Лукаша вышэй калена была адрэзана... На нейкіх нітачках, як у таго пужала на птушакэ, што ставяць па агародах, яна баўталася і пакручывалася... І страшна і непрывычна было глядзець на акрываўленаго чэлавека з нагой, павернутай пятой уперад, а пальцамі ўзад!..

У цяжкіх муках, то с поўнай прытомнасьцю, то без прытомнасці лежаў ён. На шчасьце, здарыўся нейкі доктар. Той даў скалечанаму першую помач. Тым часам нехта зьлётаў у вёску, скуль быў Лукаш, і яго хатніе і ешчэ некулькі аднаселян хутка прыехалі да пакалечэнаго. Праз гадзіну ішла машына з гораду N і з ею прыехаў спэціальна вызваны доктар. Ён зрабіў апэрацію,— адрэзаў саўсем нагу, забінтаваў яе, і праз 3 гадзіны з другой машынай, што ішла у N, адвязьлі Лукаша у N і палажылі у гарадзкую бальніцу. Беднаму Лукашу і нясьнілося, едучы у N за сваімі інтэрэсамі здаровым, прыехаць туды бязногім...

Што ж было з Агаткай? Некольки мінут яна пралежала адна на зямлі, бо ніхто не звярнуў на яе увагі: усе былі заняты Лукашом. Потым і яе ацуцілі, супакоілі і, даведаўшыся прычыны яе прыпадку, не дапускалі яе да Лукаша.

Прыехаўшы да хаты, Агатка захварэла і нескольки дзён пралежала. Пасьля устала. Шэрые, сумные дні, бытцым ня лето было, для яе пашлі адзін за другім...

А Лукаш у бальніцы ляжыць і думае, думае...

Цяжкае нешчасьце сталося з ім, цяжкіе думы, неатступные думы і днём і ў ночы... Страціў ён здароўе, — нага ня вырасьце, нявернецца ніколі... «Што цяпер Агатка?» думае ён: «ці будзе яна і цяпер любіць мяне бязногаго?» Цяжка думаць яму, а пытаньне гэта неатступна, як агнём, паліць яго сэрцэ і мозг. У нядзелю яна будзе тут, прыедзе даведацца... Які погляд, якіе першые словы яна прынясе яму? Чуткае сэрцэ Лукаша чэкало чагось нядобраго.

Памаленьку паўзуць дні за днямі... Вось прышла і нядзеля. Быў ясны цёплы дзень. Лукаш прачхнуўся рана і доўга маўчкі лежаў і ўсё а чымсі то думаў. Недзе за сьцяной гадзіннік прабіў дзевяць. Скора павінна быць тут і Агатка. Яна абецала прыехаць адна. Апіраючыся на кавёлы, ён падняўся і, прыбіраючы сваю пасьцель, прымеціў у суседа хвораго пад падушкай люстэрак, схапіў яго і глянуў. «О Божухна!. Няўжо-ж гэта мой твар!?» нязычна і з болем прашэптаў ён, і люстэрак вываліўся з рук. Разсечанае вухо і броў, брыдка зарубцаваны твар перэрабілі яго с харошаго хлопца на нейкую брыду... Пачуліся нейчые крокі і нехта загаварыў за дзьвярыма палаты. У дзьверы увайшла Агатка, пабялеўшая, з вялікімі, пекнымі і трывожнымі вачамі. Праменьні радасьці праслізнулі па твару Лукаша. О, што гэта за твар! Яна не пазнала яго. Як бы ня хочучы, няверучы сваім вачам, падышла яна да хвораго.

«Агатка! Не пазнала?» чуць чутна сказаў ён і мякка, са сьлязьмі на вачах пацалаваў яе. — Ці то пах лекарства, ці то гадлівасць хворым, ці то блізасць непекнаго твару, ці усё разам — не магла Агатка зразумець, — толькі пьцалунак Лукаша паказаўся ей нейкім праціўным. Яна, халодна сціснуўшы вусны, не адвеціла на пацалунак пацалункам, як бывала ўпярод, і нават чуць прыметна атпіхнула яго ад сябе.

Усё гэта добра прымеціў бедны Лукаш. Чаго ён так баяўся—збылося. Моўчкі, жалабна паглядзеў ён на яе.

О, скольки жальбы і жалю было у тым погляду!.. Прайшло нескольки жудасных цяжкіх момэнтоў... Першая загаварыла Агата. Загаварыла неяк фальшыва, вінавата. Ён, як праз сон, нешта адказаў і ізноў змоўк. Гутарка ня клеілася.

— Гэта ён такі!.. І мнеісьці за яго замуж! думала яна.

— Калі ж наш шлюб?—ласкава запытаўся ён, абарваўшы яе думы.

— Ніколі! — Нявольна вырвалося ў яе — і яна спалохалася сваіх слоў.

— Так!.. Дзякуй! — толькі і мог атказаць Лукаш. Ен зразумеў ўсё. Зразумеў, што кончылася любоў пекнай Агаткі, а з ей і яго шчасьця. Потым, бытцым яго што падкінуло, ён схапіўся і, апіраючыся на палкі, вышоў у другую станцію. Яна не пасьмела выйсьці за ім: злосць на сябе, чуцьцё віны сваей перад ім і ешчэ нешта цяжкае нядобрае, што пачула яна у сваей душы,—усё гэта цяжкім камянём прыціснуло яе да ложка, на каторым яна сядзела...

Падышоў Лукаш да акна, атчыніў яго. Вольны майскі воздух і гарадзкі шум раптоўнай хваляй абдалі яго. У бліжэйшай цэркві званілі на абедню. Адгэтуль, с 3-го этажа, далёка была відаць вуліца, на ей звозчыкі, праходжые. Усюды рух, радасць, сонцэ.. У бліскучай палавінцы акна, што адчынялася у сярэдзіну, ён угледзіў свой мізэрны малюнак,— і так сумна, так цяжка стала.. Глянуў ён ізноў у вакно: над камінамі дамоў праляцела стада галубкоў, з аднаго каміна ішоў сіненькі дымок. Як бы ад гэтаго дыму, у яго галаве усё памуцілося.. Падняўся ён на падаконнік, глянуў пад сабе, здаровай нагой адпіхнуўся і рынуўся с 3-го паверху галавой уніз на каменны трэтуар і як камок гліны, шлёпнуўся і прыліп да каменяў... Вочы страшна вылезлі наверх, твар абліўся крывёй.

Унясьлі яго труп у бальніцу, доктар агледзіў, паслухаў і сказаў, што ўсё кончэна...

Пасьля сталі распытываць Агатку. Тая толькі плакала і нічога толкам не магла сказаць. Што яна магла сказаць?..

Палажылі Лукаша у мярцьвецкую. Аттуль завязлі на магілкі, пахавалі і забыліся...

Праходзіў час. Лета зьмянілося восеньню, восень—зімой. Канчаўся мясаед. Агатка скора суспакоілася і забывалася аб Лукашу. Пасватаўся другі хлопец і яна пашла за яго.

Вось ужо месяц, як, пакінуўшы родную хатку, жывець Агатка у чужой вёсцы замужам.

А яе першая любоў адзінока ляжыць у занесенай сьнегам магілі і спакойна сьпіць вечным сном...

**Міхалка Галка.**

